Музычны тэкст як стымульны комплекс, расшыфроўка якога на падставе раскрыцця значнасці знака, задае структуру ўспрымання выканаўцы. Музычная семіятычная канструкцыя здольна праз псіхічную дзейнасць асобы захоўваць і перадаваць інфармацыю. Адносіны знака з тым, што ён азначае, адлюстроўваюцца ў свядомасці музыканта.

Вобразная мысль кампазітара атрымлівае сваё матэрыяльнае ўвасабленне ў кодавай упарадкаванасці музычнага тэкста. Шматразовае суаднясенне гукаў-знакаў з тымі з'явамі, якія яны азначаюць, стварае псіхалагічную падставу выкарыстання іх у якасці матэрыяла структуіравання канфігурацыйных музычных уяўленняў.

Успрыманне цесна звязана з канкрэтным характарам стымулаў, якія вызначаюць псіхалагічны настрой асобы выканаўцы. Неабходна спецыяльная накіраванасць свядомасці музыканта на уяўленне элементаў музычнага языка і яго індывідуалізавання формы ужывання ў розных кантэкстах.

На матэрыяле супастаўлення структур можна разглядаць пытанне аб значнасці элементаў інтанацыйнай праграмы, распазнаванне комплекса элементаў, якія нясуць сэнсавую нагрузку. Менавіта тыя структуры тэкста, якія адпавядаюць разуменню выканаўцы, з'яўляючыся на ўзроўні некаторых супольных уздзеючых фактараў, пранізваюць кожны акт творчай свядомасці. Такім чынам выканаўца ўсю сістэму свайго ўспрымання ставіць ва ўмовы вызначанай знакавай сістэмы музычнага тэкста.

## ГУМАНІСТЫЧНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ КНІЗЕ

В.С.Варапаева

Непарыўная сувязь пакаленняў забяспечвае рух гісторыі, прагрэс чалавецтва. Дзяцінства ж звязвае нас з мінулым і будучым. Дзеці – нашчадкі ўсёй грандыёзнай працы чалавецтва і выхаванне іх – жыццёва важная для кожнага грамадства задача. Дзіцячая літаратура – менавіта той эфектыўны сродак, які садзейнічае выхаванню. Таму і ў аснове яе павінна ляжаць канцэпцыя шырокага гу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маністычнага погляду на асобу дзіцяці: павага да яе, разуменне яе патрэб і схільнасцей, прызнанне яе багатай фантазіі і уяўлення. Дзіцячая літаратура павінна быць дзілагізаванай, пазбаўленай хлусні, фальшы, несці дзецям светлае, чыстае, добрае.

Гуманістычныя традыцыі ўваходзяць у глыбіню стагоддзяў. Міфы і легенды аб чалавечнасці, справядлівасці і дабрыні, якімі прасякнуты ранняе хрысціянства, а пазней рух Рэфармацыі, зрабілі свой пэўны адбітак і на наступныя стагоддзі. За доўгую, складаную гісторыю развіцця беларускай дзіцячай літаратуры (ад фальклору, які з'явіўся не толькі першаасновай беларускай дзіцячай літаратуры, але і як бы першым этапам яе развіцця, бо ва умовах адсутнасці беларускіх выданняў ен замяняў друкаваную літаратуру, да першых друкаваных кніг, тыпу "Псалтыра", які быў выдадзены у 1517 годзе у Празе Ф.Скарынай) існавалі розныя тэорыі, плыні, тэмы, жанры. Але, варта зазначыць, на працягу многіх стагоддзяў падымаліся у ей пытанні добрага і благога, адносіны паміж людзьмі, чалавека і прыроды.

Асноўныя гуманістычныя ідэі былі адлюстраваны у "Псалтыры" Ф.Скарыны, у "Катэхізісе" С.Буднага і іншых рэлігіезных кнігах. Меркавалася, чым хутчэй і раней засвоіць гэтыя ідэі дзіця, усвядоміць іх каштоўнасці, тым большыя у яго перспектывы стаць чалавекам. У гэтых кнігах быў моцны нацыянальны дух. Менавіта праз нацыянальнае дзіця павінна ўсведамляць і агульначалавечае.

Беларускія пісьменнікі П.Багрым, Я.Аношка, Ф.Багушэвіч, Я.Лучына клапаціліся аб выхаванні і асвеце дзяцей беларусаў, спадзяваліся, што настане час, калі

Сонца навукі праз хмары цемныя
Прагляне ясна над нашай нівай.
І будуць жыць дзеткі патомныя
Добраю доляю – доляй шчаслівай.

Гулка гучыць у іх думка аб неабходнасці глыбокага вывучэння роднай гісторыі, мовы, навучання на ей дзяцей. Ф.Багушэвіч піша: "Божа ж мой, божа, што мы за такія бяздольныя? Харваты, чэхі, маларосы і іншыя пабрацімы нашыя маюць пасвойму пісаныя і друкаваныя кніжачкі і газеты, і набожныя, і смешныя, і слезныя, і гісторыйкі, і баечкі, і дзеткі іх чытаюць так, як гавораць". Праблема нацыянальнага, а яна неадрыўна звязана і з гу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

манізмам, з'яўляецца адной з важнейшых тэндэнцый у беларускай дзіцячай літаратуры. А.Гарун, М.Танк, Н.Гілевіч, У.Караткевіч, В.Вітка, Я.Сіпакоў, Ю.Свірка і інш. сваімі творамі выхоўваюць у дзяцей пачуцце прыналежнасці да пачэснага роду беларусаў:

Я – беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі,
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі...

Н.Гілевіч

любві да роднай мовы:

Гэй, ты маці, родна мова,
Гэй, ты звон вялікі, слова,
Звон магучы,
Звон бліскучы,
З срэбра літы,
З злота збіты
Загрымі ты,
Загрымі!

А.Гарун

да чалавека працы

...Жылі калісьці крывічы...
Валілі лес, аралі ляды,
Сушылі гуртам нераты
І да туманных далягляда ў
Ганялі спраўныя плыты.

Е.Лось

Расказваючы пра гісторыю, этнаграфію, культуру Беларусі, пісьменнікі тым самым вяртаюць моладзь да каранёў сваіх.

Дабрыня і прыгажосць, абавязак і сумленнасць, міласэрнасць і іншыя гуманістычныя прынцыпы знаходзяць сваё ўвасабленне ў шэрагу твораў для дзяцей беларускіх пісьменнікаў. Героі твораў В. Віткі, А.Васілевіч, Э.Агняцвет, А.Дударава актыўна дзейнічаюць, вядуць барацьбу з тым, што парушае нармальнае жыццё, знішчае прыроду, уносіць разлад у прыгажосць і гармонію. І гуманізм усе часцей выступае як сіла наступаючая. Але поспех пісьменніку забяспечаны толькі ў тым выпадку, калі творы яго ідуць ад душы, калі ге-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рої не схематычныя, а жывыя, і дзейнічаюць, як сапраўдныя людзі. Тады чытачу не здаюцца непраўдападобнымі іх дзеянні і учынкі. Басаногая дзяўчынка Ганька з аповесці А.Васілевіч "Расці, Ганька" выступае ў ролі Маралiста. Але ей верылі. У эпізодзе, калі Ганька хацела паспрабаваць чужога гароху, а гэта убачыў прахожы, істотна адчуваецца гора і сорам дзяўчынкі, якая "сваімі уласнымі прыкрымі рукамі сапсавала настрой сабе і іншым".Думаецца, што разам з гераіняй фудзе перажываць і чытач. Запаведзь "Не украдзі" дойдзе і да яго праз вобраз эрокавы і маляўнічы. Маленькі хлопчык з "Калінавай рукавічкі" А.Васілевіч сваімі беражлівымі адносінамі да прыроды, насуперак прагнозам ветрабяздомніка, дае маральны урок чытачам: "Не бойся, калінка-малінка. Мае ручкі не злыя. Галінак тваіх не паломяць, вершалінкі не акрышаць. Толькі ягадкі сарвуць - маме на лякарства..."

Самабытны ў сцвярджэнні гуманістычных адносін і Павел Місько. Яго творы для дзяцей - жыццясцвярджальная, чыстая крынічка, якая поіць малых светлым гумарам, прымушае як у люстэрка зазірнуць у самога сябе, часам збоку, задумацца. У кнігах "Навасёлы", "Прыгоды Бульбобаў", "Як на нашы імяніны" ёсць усе: і прыгоды, і барацьба дабра са злом, і шмат пазнавальнага, а галоўнае - яны неназойліва вучаць дзяцей быць людзьмі. Творы не толькі цікавыя па зместу, але і арыгінальныя па пабудове: самабытная дзіцячая мова, яркія захапляючыя падзеі, псіхалагічна абгрунтаваныя учынкі - усе, што так вабіць дзяцей у сапраўднай мастацкай кнізе. На вялікі жаль, такіх кніг у нас яшчэ мала. А пры дыфіцыце высока-мастацкіх кніг, пры непрадуманай выдавецкай палітыцы рэпертуар дзіцячага чытання штучна дэфармуецца. У гэтай сітуацыі менавіта творы невысокіх мастацкіх якасцей - літаратурныя сурагаты - уплываюць на фарміраванне і выхаванне асобы. Выйсце - у прадуманай сацыяльнай палітыцы, якая б гарантавала правы дзіцяці на атрыманне неабходнай ей літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ